Беларускі шлях

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
...рпухоуская вул. д. № 12

...акцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
...іністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
...акцыя пакідае за сабой права па... уляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 8 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 77. Менск. Пятніца 28 чэрвеня 1918 г. Год I

Менск 28/VI.

—

...эзба «тягучэй» інтэлігэнцыі.

...Мала інтэлігэнцыі!
...дзе яе узяць? Вайна, рэва...цыя, грамадзянская вайна ...іла і косіць, як траву, лю...й. Забілі, чытаем, сэнатара ...ашэннікова, земскаго віднаго ...ячa Вырубова, пятаго, дзе...таго... За што, і як? Так ...бе, ли разрыукі з рэвольвэ... у лоб нікто краснаармеец, ...ьбо нехто з кучы народу. ...альнуу і німа умствевнай ...вініцы, спэцыялiста. Гаварыу ...ера с старым магілеускім ...ацоунікам. Чалавек с жывой ...шой семідзесятніка, быу тол...оуцам. Ужо тып у наш ву...ина-дэмакратычны век рэдкі. ...эяк у яго вочы, як ніжывыя. ...ольшэвіцкі «таварыш» у на...ксе застрэліу яго жонку і ...чку! Для нашаго пакалення ...ко за-многа усіх гэтых за...уств і пагромау культуры. ...екалі усе гэта зарасьце тра...ой. Але многа кілясоу пашні...ы звядуцца на доугія годы ... гэта амаль ва усей Эуропе. ...Францыі забіта каля 300 ...есьняроу, у Гэрманіі як і у ...ас усе студэнты, краса ва...ьі кінулі на 4 года навуку. ...ры гэтых варунках трэба бу...аваць нацыі, дзержавы, гу...эрні, воласьці... Мала на гэ...а інтэлігэнтных сіл. Некалі ... гаварыу на адным зьездзе ...ерад вайной, што у Беларусі ... Літве, з усіх нацый набя...эцца віднейшых дзеячоу, съалі ...ямлі, чалавек 50-60. Расія...кія дзеячы мне адказалі, а у ...ас на Маскву, Пецярбург ча...лавек 150-160, ні больш. ...Ясна, што пакуль падгадуецца ...новае пакаленне, будзе пэуны ...упадак духоунай культуры. ...Новыя сьветачы розуму і на...вукі накажуцца ні так скора. ...Цяперашней жывой інтэлі...гэнтной сіле трэба напрагчы ...усе здольнасьці і практыку ва ...рэгуліраваня усіх бакоу на...цыянальнаго нашаго жыцця. Ні ...можна ухіляцца нікому з бе...ларусау ад адпаведных аба...вязкау да свайго народу і ...краю.

Трэба быць у працэ «цягу...чым», а у нас многа сьсць крытыкоу, а менш працоунікоу, добрая, прыхільная і творчая крытыка карыстна, гэта есьць дрожджы.

Беларусь перажывае такі момэнт, што пойдзе, альбо у ніз альбо у гару. Усім дружнай і суменнай сямьей, пара ужо с арганізавацца так каб началася творчая праца, ні будзем траціць дарагіх цяпер сіл на сваркі і трэння партый і групп.

Будзем браць прыклад з селян нашаго вялікаго беларускаго племяні. Яны аруць, сеюць, будуюцца ні грацячы хвілі, ад заранкі да заранкі. Народ свой абавязак строгай працы над узбагаценіем края выпоуняе, інтэлігэнцыя павінна вясьці сваю высокую працу, народ гэта ацэнiя.

А. У.

Агульныя весткі.

—

ЖЭНЭВА, 23/VI. Амэрыканскі урад прапануе браць на ваенную службу да 41 года. Як „паведамляець" Нью-Іорская газэта «Дэйлі Тэлеграф», гэта рашенне было прынято дзеля апаскі, што ніпрыўлечэнне усіх асвабоджаных ад воінскай павіннасьці можа стварыць такія ніпрыемлімыя варункі, якіх можна абийсьці.

БАЗЭЛЬ, 24/VI. Ст. Галенская газэта паведамляе з Лёндана аб новым занядужэнні, якое там часта зьяўляецца, напамінаючае сабою мецінгіт і носіць назву Ботулізмус. Лекары тлумачуць гэта занядужэнне цяперашняй дыэтай. Апрача таго у ангельскіх войсках пануе так званая акопвая ліхарадка, перэнасімая рознымі мухамі.

ЖЭНЭВА, 24/VI. Як паведамляе «Пэтыт Парызьена» знамэнітыя фрэскі с Парыжскаго Пантэона адпраўлены у правінцыю.

ЖЭНЭВА, 24/VI. С прычын начаўшыхся эпідэмічных занядужэнняў, якія мабыць канчаюцца сьмертнымі выпадкамі, француzкі ваенны міністр на нівядомы срок забараніў даваць одпуск салдатам у 31 мест і вёсак, якія знаходзюцца у 18 розных дэпартамэнтах.

— Лёнданская газэта «Гэральд» ад 25 мая піша: Апошняя прамова Вільсона стане вялікай ніпрыемнасьцю для яго прыхільнікаў, да якіх, як мы прымушаны казаць праўду, нам усё болей цяжка далучыць сябе. Ен кажа аб «нішчырых» спробах дабіцца міру, нібы то апошнія гэрманскія спробы у гэтым кірунку, былі ядзінымі калі кольвек зробленнымі, (пры чым ён лічыў патрэбным забыць адказы Чэрніна— Гэртлінга на яго ўласныя прамовы, і нібы то сіванім «нішчырасьць» азначае і «ніпрыемлімасьць». Ен павядоміў так сама аб массе высокіх мэт, якія павінны бы адушэвіць страну у часе вайны Мы згаджаемся з ім—але якога мнения прэзыдэнт Вільсон аб тайных згодах сваіх ўласных хаўруснікаў? Калі прычына яго мучэнняў і ёсь гэта «нішчырасьць», дык ён павінен быў бы мець на яе уплыў дэлікатным і прыязнэным напорам.

— **Колькі каштуе амэрыканскі салдат.** З вататкі, друкаваўшэйся у «Нью Йорк Таймс» ад 20-го мая выясняецца, што адукацыя і абмундзіроўка аднаго амэрыканскаго салдата, перад яго адпраўкай у Эўропу, абходзіцца ураду у сярэднім у 15,000 даляраў.

Весткі з Расіі.

—

Мобілізацыя на Паволжу.

Кіеўскай радіотэлеграфнай станцыяй перанята тэлеграмма совнаркома у якой аб'яўляецца прымусовая мобілізацыя работнікаў і селян Паволжа. Такая-ж мобілізацыя аб'яўляецца у нікаторых губэрнях і абласьцях заселяных казакамі. Прызываюцца людзі прызываў ад 1893 да 1896 г.

Выдаление меньшэвікоу і правых с.-р.

14 гм. на пасядзэнні ц. в. к. было пастаноулено выключыць з складу камітэту прэдстаўнікоў меньшэвікоў і правых с,-р. у зьвязку з учасьцем гэтых партыяў у проціў большэвіцкім руху на Доне і у Сыбіру.

Насяленне Масквы.

Подлуг ніскончанай апрацаваннем профэсіональнай перэпісі у Маскве лік жыхароў цяпер 1.716.000 чалав. Беззработных 91.000 чалав. Жывучых сваім заработкам 866.000 чал.

15.000.000 на саматушку.

На пасядзэнні агульнаго сходу Омскаго савету 11 мая у паведамленні краёвай харчовай рады было сказано, што селяне у Алтайскай губ. ні давалі хлеба нават у абмен на мануфактуру. За зіму было у той-жа час зніштожано 15.000.000 пудоў хлеба на саматушку.

З Украіны.

—

Рэформа земскаго і меськаго Самапраулення.

Як паведамляюць с Кіева, камісія да рэформы меськаго самаупраўлення пад прэзоўствам Н. Н. Дьякова адкінула агульнасьць і роўнасьць пры выбарах у меськае самапраўленне і 14 проціў—10 галаласоў выказалася за курыяльную сыстэму.

Камісія да рэформы земскаго самапраўлення прыняла так сама курыяльцую сыстэму. З гэтай прычыны членам камісіі А. А. Свечыным быў паданы асобны узгляд. «У інтарэсах дзержавы, кажа п. Свечын, трэба застанавіцца на захаванні іступючай выбарнай сыстэмы пры варунку праўдзіваго абезпечэння вольнасьці і таемнасьці выбараў і нiучасьці у іх арміі і асобаў ні дайшоўшых сталасьці».

Н. Н. Дьяков —акцябрыст— даўнейшы старонік сталыпінскай партыі.

«Эканомія часу».

Дзержаўны кантралёр Афанасьев запрапанаваў дырэктарам дэпартамэнтаў для «эканоміі часу» падаваць яму усе даклады напісаным па руску.

«Н.—с.».

Зьезд народных соцыялістаў у Кіеві аднагалосна пастанавіў дзеля выясьніўшагося курсу украінскаго ураду адазваць усіх сваіх прэдстаўнікоў з адказных мейсц у урадзе.

Мірная конфэрэнцыя.

18 чэрвеня, ад 5 да 9 гадзін вечара, ішло пасядзэнне зьмешанай палітычнай камісіі абодвых дэлегацыяў. На пасядзэнні абгаварываліся толькі пытання аб граніцах. Кожная з старон моцна стаяла на сваіх пазыцыях у гэтым пытанні. Намечаныя украінскай дэлегацыяй граніцы яна бараніла глаўным чынам такім аргумэнтам: «Усякая новаабразованая дзержава патрабуе выгодных стратэгічных абсталюнкаў і патрэбы дзержавы часто вымагаюць нікаторых пашырэнняў тэррыторыі за рахунак этнографічных прынцыпаў. Прэдстаўнікі Расійскай дэлегацыі выступаюць проціў ссылаючыся пры гэтым на 3 універсал, у якім граніцы Украіны захапляюць тэррыторыю значна меньшую, чым цяпер дамагаецца украінская дэлегацыя. Прэзэс Рас. дэлегацыі Х. Г. Ракоўскі з цыфрамі у руках даводзіў, што украінцы пасягаюць на адвечна вялікарускія землі. Ваенны экспэрт рас. дэлегацыі ген. Сытін сваю прамову па поваду тэррыторыяльных дамаганняў украінскай дэлегацыі скончыў такімі слоўмі: «Гэтакіх вывісэкцыяў народы ніколі ні прабачаюць».

Прэдстаўнікі украінскай дэлегацыі заявілі, што пакідаюць за сабой права адказаць на другім пасядзэнні палітычнай камісіі.

Закупна збожжа за срэбраныя грошы.

З Мелітополю ад 18 чэрвеня паведамляюць, што нямецкія ўлады палажылі у дзержаўны банк на 2 мільёны грыўняў марак сярэбранымі знакамі у распараджэнне бюро для закупу збожжа.

Новыя аустро-вэнгерскія войскі у Адэсі.

Ад 19 чэрвеня з Адэсы паведамляюць, што губэрнатар фон Бельц афіцыяльна апублікаваў у газэтах: на днях у

Адэсу прыбылі новыя аўстро-вэнгерскія аддзелы. У такі спосаб лічба адэскага гарнізону значна павялічылася.

— Ваеннае міністэрство выдало распараджэнне, каб аслабаніць усе школьныя ўмешканні занятыя войскамі і на далей іх для войска ні занімаць.

— Міністэрствам вызнанняў зацьверджэна тымчасовая **х о л м с к а я д у х о ў н а я к о л л е г і я** у складзе прэдстаўнікоў Холмшчыны, Падоліі, Палесся і Валыні для заведываньня духоўнымі справамі гэтых районаў.

— 18 чэрвеня у Кіеў прыбыў б. Кіеўскі, Подольскі і Валынскі ген. губэрн. Ф. Ф. Трэпаў. На вакзалі генэр .спаткалі начальныя асобы.

— Начальнік Палескіх ж. д. Н. Н. Старжынскі пераводзіцца у Кіеў на пасаду начальніка поўдз.-зах. ж. д.

Ад 18 чэрвегя з Адэсы паведамляюць аб новых пажарах. Другі дзень гараць склады ваенна-прамысловаго камітэту з запасамі масла і консэрваў. Агонь перакінуўся на суседнія прыватныя склады. Працуюць усе пажарніцкія каманды.

18 гм. прэдстаўнік войска Донскаго падаў Украінскаму ураду протэст, проці другога пункту дагавору аб пераміры прынятаго рускай і украінскай мірнымі дэлегацыямі. Такі дагавор вроблены без ведама Донскаго ураду з'яўляецца нарушэннем правоў Дону, які вядзе барацьбу с пасланымі сав. нар. камісараў у Войско чыронагвардзейцамі.

Пунктам другім памянёнаго дагавору праезд расійскіх і украінскіх падданых павінен адбывацца праз тэрыторыю В. Донскаго.

— Кіеўскія газ. ад 20 гм. паведамляюць аб ад'ездзе у Бэрлін па службовым справам нямецкаго пасла на Украіне барона ф.-Мумма, прыбыцце каторага назад у Кіеў чакаецца у панядзелак. Часова справамі пасольства заведаваў райца пасольства граф Бэркен.

— 20 гм. у Кіеві аткрыўся ўсеукраінскі царкоўны сабор. Асобная увага у працы сабору будзе удзелена пытанню аб автокефаліі украінскай царквы і украінізацыі царкоўнай службы.

Сэссія мае працягнуцца 2 тыдні каб ізноў адчыніцца ў кастрычніку.

Парцэляцыя зямлі на Холмшчыне.

Нескольні ашчадна-пазычковых таварыстваў на Холмшчыне уводзяць новы гатунак опэрацыі купляння і прадажы зямель і лясоў на вырубку.

Каб завясьці у сябе такія опэрацыі — памянёныя т-вы прышлі праз тое, што у апошнія часы пачалі паўставаць прыватныя парцэляцыйныя суполкі, закладаныя потарыяльным способам, да усякіх парцэляцыйных опэрацыяў. Такія суполкі да гэтай пары ні дазваляліся ні толькі на Холмшчыне, але у другіх часьцях Польшчы, бо ствараліся яны найчасьцей усякаго гатунку спэкулянтамі, якія гналіся толькі за ўзыскам. Яны ні маюць на увазе будучыя замеркавання аграрнай рэформы і землеўстройства і вядуць парцэляцыю з вялікім ушчэрбам для гэтых замеркаванняў.

Ашчадна-пазычковыя т-вы арганізуюць парцэляцыйныя опэрацыі подлуг каталту і прынцыпоў польскіх парцэляцыйных суполак у Галіцыі і Познані і пакуль што займаюцца парцэляцыяй для сваіх членаў.

«Dz. P.» № 167.

З Крыму.

Сэвастополь 18 чэрвеня. Нямецк. камандуючы войск. Крыму ген. Кош адказау дэлегатам земств і гарадоу: Немцы браць улады ні хочуць, даюць аутаномію.

Соцыялістычны савет народн. прэдст. аказауся безчынным, дзеля гэтаго немцы будуць прызнаваць толькі татарау. Час для поунай вольнасьці сходау і друку ішчэ ні падыйшоу, бо могуць зноу пачацца разрухі. Для улагоджывання ніпаразуменнеу пры рэквізыцыях камандзіреван ахвіцэр.

Міністрам фінансау крымскаго ураду назначаны дыр. Злучанаго банку гр. Татшуев, дарог—ваенн. інж. Фрыдман.

Адэсса 19 чэрвеня. Новы Крымскі габінэт, як высняецца у сваей большасьці значна правей к.-д.: у яго ўступілі дзеячы з устаноўленай рэакцыйнай рэпутацыяй.

— Паведамляюць з Адэсы ад 18 чэрвеня аб складзе крымскаго ураду: прэм'ер — Сулькевіч, ўнутраных спраў — Налбандов, прасьветы — земец Келлер, дарог — інжын. ген. Фрыдман, землеробства — князь Голіцын, загранічн. спрау — быўш. пасол у Турцыі Чарыков. Быушаму прэм'еру Сейдамету прапануецца пасада пасла у Турцыю. Марскім міністрам назначан капітан Жандр.

— Новы прэм'ер ген. Сулькевіч, як ад 17 гм. паведамляюць з Сэвастопалю, запрапанаваў усім інстытуцыям Крыму ні зносіцца нінасрэдна з Украінай, ні атказываць на яе запытання, а аб усім паведамляць яго, Сулькевіча. Усе менне скарбу аб'яўляецца ўласнасьцю крымскаго ураду.

Міністр. народн. прасьветы назначаецца проф. Туган.-Барановскі.

Маленькі фэльетон.

Там...

Скачуць, пруць ва усе бакі
Там латышскія стрэлкі.
І ад гэтакіх прыблуд
Плача—стогне бедны люд.
Барацьбу вядуць там з вёскай
І ідуць у ход там розгі...
Бо апошні кусок хлеба
У селян забраці трэба.
У Леніна шмат новых дзей—
Па вёсках «ажыўляць» людзей.
«Гэй, прачніцесь, батракі!
Ля вас селяне—«кулакі».
Бейцесь, людзі, там скаламі,
Ды з віламі, ды з граблямі.
Гэта трэба нам для справы,
Каб народ быў вельмі жвавы.
Хай трашчаць усюль чубы
Ад вялікай барацьбы.
Будзем цьвёрда ўласьць трымаць,
Ды рабочых ўсюль стрэляць.
Па соцыяльнаму кірунку
Нам ісьці німа рахунку.
Лепш па стараму звычаю
Будзем мы гуляць па краю.
Хай «таварыш»—хуліган
І чырвоны наш буян
Усюль наводзюць пераляк,
То для ўласьці—плюс, прысмак.
Хай міністры крадуць грошы,
Нам ад гэтаго ні горшай.
Так традыцыя дыктуе,
Каб ачысьціць ад буржуяў
Большэвіцкі родны край
І перарабіць на рай.»
Скачуць, пруць ва ўсе бакі
Там латышскія стрэлкі.

Я—р.

Менскае жыццё.

Яг. Раман Скірмунт, катораму даручэно формавание новаго беларускаго ураду, вярнууся 26 гм. у Менск. Пасьля паведамлення Народнаму Сэкрэтарыяту аб рэзультатах паездкі на Украіну, яг. Р. Скірмунт прыступіць да актыунай чыннасьці, што да формавання ураду.

Домініканскі касьцел, Рэстаурацыя домініканскаго касьцелу, якая робіцца на добрахвотныя даянні главнае простанародзья сьпешна рухаецца наперад.

Гэтымі днямі у першы раз паступілі ахвяры ад вялікай буржуазіі — землеуласьнікау Ельскаго 1,100 руб. і Ваньковіча 100 руб.

Аднача͏сова з імі сталяр дау 300 руб.

Рэстаурацыю касьцела, якога у шырокіх кругах называюць «дэмократычным», маюць закончыць к восені.

На водаправодна-электрычнай станцыі апошнім срокам плацежа за адпушчаную энэргію у красавіку і маю апавешчано 30-е чэрвеня.

Менскі катэдральны касьцел с прыездам у Менск епіскапа Лозінскаго мае зрабіцца толькі Катэдральным, а ні парахвіяльным.

У губэрнскім прысуцтвіі атрымалі запытанне нямецкіх уласьцей аб дзеяльнасьці сэрвітутна-чыншавога аддзелу, раскасіраванаго большэвікамі.

Сярод чыноўнікау скарбовай палаты, казначэйства і інш. маднее пэунасьць у мажлівасьці павялічэння істнуючых у іх норм пэнсіі замест цяперашніх 50%—75%, да 100%.

«Русское общественное собраніе» хадатайствуе перад нямецкімі уласяцьмі аб асвабаджэнні ад рэквізіцыі свайго памешкання і мэбелі.

У майстэрні губ. земства (Старажоуская) патрабуюцца слесары і кавалі для выробкі плугоу, барон і інш.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 26 чэрвеня 1918 року.

Заходні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Паўднёвей Скарпы англьцы сілаю у нсколькі батальёнаў зрабілі атаку учора з рання на шырокім вучастку. У Фэшы і Невіль-Вітоса яны былі адкінуты контр-атакай. Варожыя набегі у суседніх вучастках адбіты нашым агнём. Артылерыйская дзеяльнасьць ажывілася у вечары амаль на усім фронці. Між Аррасам і Альбэртам і па абодвых баках Соммы яна і у ночы была ажыўлёнай. Нескольні разоў вораг высылаў наперад сільныя разведкі. Ен быў адбіты аставіўшы палонных у нашых руках.

Група арміяу Германскаго Кронпрынца.

Між Аўрай і Марнай часткамі ажыўлёная баевая дзеяльнасьць. Заходней Уазы мы у боях на перадавых лініях ўзялі французкія кулямёты. Варожая часьцічная атака паўночней Шато-Тьеры адбіта.

Гр. ар. Герцога Альбрэхта.

Паўночней канала Рэйн—Марна баварскі ландвэр прабраўся у французкія пазыцыі паўночна-заходней Бюро і прывеў 3 ахвіцэраў і 40 салдат палоннымі.

3 варожай эскадрылы, праляцеўшай 24 чэрвеня усходней Суассона па напрамку да р. Эн з мэтай кідаць бомбы, збіты 5 ўваздушных апаратаў. І зьбіты 12 ўваздушных апаратаў і 3 прывязных шары.

Лейтэнант Удэт атрымаў 33, 34 і 35, лейтэнант Кірштэйн 27, лейтэнант Румей 24 лейтэнант Вэльшэнс 24 лейтэнант Білліг 21 перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Весткі с краю.

Гомэль 17 чэрвеня. Гэтымі днямі пушчаны у ход пабудованы у Урокове каля Гомлю першы у нашым краі коапэратыўны завод для выробу хромавой косьці. Цэны на харчовыя прадукты павышаюцца с кожным днём: жытняя мука даходзіць да 100 рб. пуц, цукер да 6 рб. фунт., гарбата 60 рб., мыло—5 рб. сьвечы—12 рб. газа 10 рб. фунт.

У паветоваго старасты адбылася нарада для аб'еднання способаў барацьбы проціў спэкуляцыі, якой выкліканы узрост цэнаў.

Урад Літвы запрапанаваў ж. д. служачым палескіх жалезьніц службы на жалезьніцах Літвы. Літвінам, б. служачым прывісьлянскіх жал. дазволено вярнуцца на мейсцо даўнейшай службы. Ім выдзеляецца 60% усіх вольных пасадаў.

Віцебск 17 чэрвеня. Увесь склад рэдакцыі віцебскай газэты «Церковно-Общественная Жизнь» з рэдактарам Артоболевскім начале арыштаван за марство на партыю камуністаў. Кніжны склад Абмошэва за продаж гэтаго выдання запечатаван.

Часьці 1-го 2-го чырвонаармейскіх палкоў у полным узброенні явіліся к гмаху ваеннаго комісарыяту і запатрабавалі заплаціць ім за нівыданую у мінулыя тыдні харчовую пайку за хлеб па 5 р. цукер 15 рб. фунт., і г. Латышскія стральцы і варшаўскі рэвалюцыйны батальон заявілі, што яны так сама адчуваюць нідастаткі, але ні пазволяць сабе выкарыставаць цяжкаго становішча проці савецкай ўлады. Пасьля цэлай раду прамоў інцыдэнт скончаны. Настаноулено паслаць у Маскву дэлегацыю ад усіх чырвоно-армейскіх аддзелаў.

Рэдактар А. Прушынскі.
Выдавецтво «Т-во Заранка.»